Федэральнае міністэрства замежных спраў

CIVIL SOCIETY COOPERATION

Берлін, 26 верасня 2024 года

# Пашырэнне супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю краін Усходняга Партнёрства і Расіі

Праграма па пашырэнні супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю краін Усходняга Партнёрства і Расіі дапамагае грамадзянскім супольнасцям адыгрываць сваю ролю важных суб’ектаў дэмакратычнага развіцця, а таксама падтрымліваць трансфармацыйныя працэсы, што працягваюцца ў краінах рэалізацыі праграмы. Праз праграму Усходняга Партнёрства Федэральны ўрад падтрымлівае меры, **накіраваныя на стварэнне і пашырэнне доўгатэрміновых структур супрацоўніцтва грамадзянскіх супольнасцяў паміж дэмакратычнымі, недзяржаўнымі суб’ектамі з Германіі і краін Усходняга Партнёрства (Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны) і Расіі. Пры гэтым гаворка ідзе пра супрацоўніцтва і раўнапраўнае падзяленне задач паміж партнёрамі па праектах у Германіі і адпаведных краінах праграмы.** Гэта ўключае ў сябе ўвесь дыяпазон праектнай працы ў сферы культуры і адукацыйнай палітыкі (у прыватнасці СМІ, навукі, адукацыі, у тым ліку прафесійную адукацыю, культуру, мову і працу з моладдзю).

Ва ўмовах захопніцкай вайны Расіі супраць Украіны, якая парушае нормы міжнароднага права і працягваецца ўжо трэці год, а таксама далейшага звужэння прасторы для дзеянняў для **суб’ектаў і структур грамадзянскай супольнасці** падтрымка гэтых суб’ектаў і структур застаецца рэлевантнай ва ўсіх краінах праграмы Усходняга Партнёрства. З улікам гэтых падзей у перыяд рэалізацыі **праграмы Усходняга Партнёрства ў 2025 годзе наш галоўны інтарэс па-ранейшаму** – (1) **узмацненне і аднаўленне структур грамадзянскай супольнасці ў кантэксце еўрапейскай інтэграцыі і супрацоўніцтва;** (2) **узмацненне ўстойлівасці супраць спроб дэстабілізацыі з боку Расіі і падтрымка незалежнага, нейтральнага і інклюзіўнага асвятлення падзей** шляхам прафесіяналізацыі журналістаў і суб’ектаў грамадзянскай супольнасці, усталявання сувязей паміж імі і захавання іх прафесійнай занятасці – у тым ліку і ў часовай эміграцыі, а таксама (3) **падтрымка удзелу жанчын, маргіналізаваных і ўразлівых груп насельніцтва ў палітычным і грамадскім жыцці** ў адпаведнасці з прынцыпамі феміністскай знешняй палітыкі.

Гэтымі мерамі мы хочам падтрымаць працу грамадзянскіх супольнасцяў у краінах Усходняга Партнёрства і дэмакратычай грамадзянскай супольнасці ў Расіі і Беларусі і павысіць устойлівасць супраць дэзінфармацыі ў грамадстве. Абмены і культурна-палітычныя меры для дыскусій аб агульных каштоўнасцях і правах чалавека, а таксама праекты па акадэмічнай, прафесійнай і грамадска-палітычнай адукацыі моладзі могуць стаць матывацыяй для павелічэння грамадскай актыўнасці.

## I. Усе праекты павінны быць накіраваны на дасягненне мінімум адной з наступных <u>першарадных мэт</u>:

**1. *Умацаванне плюралізму і ўстойлівасці* – для падтрымкі разнастайнасці меркаванняў і СМІ і барацьбы з дэзінфармацыяй.**

Ідэя плюралізму – цэнтральны, утвараючы элемент сучасных дэмакратый. Адным з важнейшых праяўленняў іх легітымнасці з’яўляюцца прызнанне і павага да разнастайнасці меркаванняў, інтарэсаў і мэт, якія існуюць у грамадстве.

У рамках праграмы Усходняга Партнёрства падтрымліваюцца праекты, якія садзейнічаюць стварэнню і пашырэнню разнастайнасці інфармацыі, меркаванняў і СМІ, змагаюцца супраць дэзінфармацыі і павышаюць устойлівасць. У прыватнасці, разглядаюцца праекты, якія спрыяюць устойлівасці грамадстваў супраць ненадзейнай і памылковай інфармацыі шляхам узмацнення ролі і павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў СМІ, а таксама паляпшэнню доступу да якаснай і плюралістычнай (лакальнай) інфармацыі ў СМІ. Да таго ж неабходна аказваць такую падтрымку журналістам і работнікам СМІ, у тым ліку і ў часовай эміграцыі, каб яны маглі працягваць займацца сваёй прафесійнай дзейнасцю да з'яўлення магчымасці вяртання на радзіму.

**2. *Спрыянне дыскусіям аб каштоўнасцях і правах чалавека* – для паглыблення ўзаемаразумення.**

У рамках гэтага накірунку падтрымка можа быць аказана перш за ўсе праектам па абмене і культурным праектам. Мерапрыемствы па арганізацыі сустрэч павінны рабіць магчымымі абмен думкамі аб фундаментальных каштоўнасцях, такіх як павага да правоў чалавека, правамернасць кіраўніцтва, незалежнасць судоў, права асобы на жыццё і свабоду развіцця, а таксама мажарытарны прынцып прыняцця рашэнняў. Сумеснае адстойванне гэтых каштоўнасцяў спрыяе ўзаемаразуменню ўнутры рэгіёну краін Усходняга Партнёрства і ўсвядомленаму ўспрыманню гэтых краін у Германіі.

Падтрымка можа быць аказана мерапрыемствам, якія садзейнічаюць перадачы і ўмацаванню асноўных каштоўнасцяў, названых вышэй, праз абмен у грамадзянскай супольнасці або культурна-палітычныя мерапрыемствы, а таксама спрыяюць наладжванню кантактаў у грамадзянскай супольнасці краін-партнёраў. Акрамя таго, падтрымку атрымліваюць ініцыятывы, якія робяць бачнай уласную ідэнтычнасць краін Усходняга Партнёрства ў Германіі.

**3. *Стварэнне перспектыў будучыні і дэмакратычнай трансфармацыі* – для ўзмацнення дэмакратый, барацьбы з карупцыяй, дзеянняў, накіраваных на набліжэнне да ЕС, і адначасова забеспячэнне індывідуальных шансаў на адукацыю.**

У рамках гэтай мэты падтрымка можа быць аказана ініцыятывам, якія ўзмацняюць дэмакратычныя памкненні для стварэння надзейных грамадскіх перспектыў будучыні для ўсіх. У прыватнасці, ва Украіне нашым прыярытэтам з’яўляецца падтрымка трансфармацыйных працэсаў і захаванне, а таксама аднаўленне структур грамадзянскай супольнасці, якія былі разбураны ў захопніцкай вайне Расіі. Акрамя гэтага, мы падтрымліваем праекты, якія ў той жа час улічваюць перспектыву ўступлення ў ЕС Украіны, Рэспублікі Малдова і Грузіі. Падтрымка таксама можа быць аказана мерапрыемствам у сферы акадэмічнай, прафесійнай і грамадска-палітычнай

адукацыі і павышэння кваліфікацыі, якія матывуюць да павелічэння грамадскай актыўнасці і робяць магчымым удзел у палітычнай і грамадскай дзейнасці.

4. ***Падтрымка дыялогу і збліжэння*** **– меры ўсталявання даверу для пераадольвання рэгіянальных канфліктаў у перспектыве.**

Падтрымка можа быць аказана мерапрыемствам, якія пры выкарыстанні інструментаў з сферы культуры і адукацыі садзейнічаюць прадухіленню або пераадольванню крызісаў у нявырашаных рэгіянальных канфліктах і такім чынам ствараюць глебу для ўзаемаразумення ў перспектыве. У 2025 годзе гэта мэта важная для атрымання падтрымкі ў прыватнасці ў краінах Паўднёвага Каўказа (Арменія, Азербайджан, Грузія), а таксама ў Рэспубліцы Малдова. У ходзе захопніцкай вайны Расіі людзі з Украіны, Расіі і Беларусі таксама, паміж іншых, былі вымушаны пакінуць сваю радзіму і пераехаць у іншыя краіны Усходняга Партнёрства, таму што адчувалі, што праз іх перакананні ім пагражае небяспека і рэпрэсіі. Праекты, якія скіроўваюць увагу на аспект усталявання кантактаў паміж гэтымі людзьмі і грамадствам (грамадзянскай супольнасцю) на іх новай радзіме, таксама могуць атрымліваць падтрымку.

## II. **<u>У 2025 годзе</u> пры выбранні праектаў для падтрымкі перавага будзе аддавацца тым праектам, якія маюць сувязь з адной з <u>наступных тэм</u>:**

1. ***Узмацненне і аднаўленне сетак кантактаў грамадзянскай супольнасці ў кантэксце еўрапейскай інтэграцыі і супрацоўніцтва***

Захопніцкая вайна Расіі стварыла вялізныя выклікі для працы суб’ектаў грамадзянскай супольнасці, у тым ліку звязаныя з усё большым абмежаваннем прасторы для дзеянняў грамадзянскай супольнасці. Мы хочам і далей узмацняць недзяржаўныя структуры і падтрымліваць аднаўленне грамадзянскай супольнасці, асабліва ў краінах-кандыдатах на ўступленне ў ЕС, у прыватнасці, у Грузіі, Рэспубліцы Малдова і, перш за ўсё, ва Украіне – у тым ліку ў адпаведнасці з вынікамі Міжнароднай канферэнцыі па пытаннях аднаўлення Украіны, якая прайшла ў Берліне ў чэрвені 2025 года – а таксама ў Арменіі. Мы хочам узмацніць падтрымку праектаў, якія спрыяюць працэсу збліжэння з ЕС і падтрымліваюць неабходныя рэформы, выступаючы, напрыклад, за падтрымку дэмакратыі, прынцыпаў прававаой дзяржавы ці барацьбы з карупцыяй.

Унёсак у гэтыя працэсы робяць, паміж іншага, фарматы абмена меркаваннямі і сустрэч паміж маладымі людзьмі, з асаблівым фокусам на Арменію, Грузію, Рэспубліку Малдова і Украіну.

2. ***Узмацненне ўстойлівасці супраць спроб дэзінфармацыі з боку Расіі і падтрымка незалежнага, нейтральнага і інклюзіўнага асвятлення падзей***

Падтрымка павінна аказывацца праектам, якія супрацьстаяць кампаніям па дэзінфармацыі і фальшывым навінам, спрыяюць развіццю медыяпісьменнасці сярод людзей, якія не належаць да пакалення, якое вырасла ў дыгіталізаваным свеце, і садзейнічаюць свядомаму, самастойнаму і крытычнаму спажыванню медыякантэнту. Да гэтага адносіцца прафесійнае развіццё і павышэнне кваліфікацыі журналістаў і работнікаў СМІ і ўсталяванне сувязей паміж імі. У адносінах да Расіі і Беларусі праграма Усходняга Партнёрства асабліва падтрымлівае стварэнне структур у часовай эміграцыі. Захаванне працаздольнасці расійскіх і беларускіх работнікаў СМІ незалежна ад месца знаходжання спрые крытычнаму падыходу да карыстання сродкамі масавай інфармацыі і ўскосна ўзмацняе дэмакратычныя структуры ў адпаведных краінах. У той

жа час такім чынам ствараецца доступ да незалежных навін як для людзей у вышэйзгаданых краінах, так і для тых, хто знаходзіцца ў эміграцыі.

3. ***Падтрымка ўдзелу жанчын, уразлівых і маргіналізаваных груп насельніцтва ў палітычным і грамадскім жыцці***

Гэта праекты, якія прыцягваюць увагу да грамадскай актыўнасці жанчын, прадстаўнікоў супольніцтва LGBTIQ, уразлівых ці маргілізаваных груп насельніцтва і ўмацняюць іх сувязі з іншымі суб’ектамі грамадзянскай супольнасці. У рамках феміністкай знешняй палітыкі Федэральны ўрад Германіі імкнецца да таго, каб усе групы насельніцтва былі далучаны да прыняцця палітычных рашэнняў, а таксама да іх больш актыўнага ўдзелу ў палітычным і грамадскім жыцці. Гэта датычыцца і па-ранейшаму недастатковай прадстаўленасці жанчын у дапалітычнай і палітычнай прасторы.

Гэта таксама датычыцца праектаў па супрацоўніцтве з актыўнымі ўдзельнікамі грамадзянскай супольнасці, якія падвяргаюцца пагрозе, і ўразлівымі групамі насельніцтва, такімі, як дзеці і моладзь, людзі з інваліднасцю і прадстаўнікі супольніцтва LGBTIQ, праектаў, якія пашыраюць іх удзел ў палітычным і грамадскім жыцці, і праектаў, якія рэалізуюцца за межамі агламерацый населеных пунктаў/ у сельскай мясцовасці.

**<u>Фармальныя перадумовы (больш падрабязная інфармацыя ў раздзеле FAQ (папулярныя пытанні))</u>**

Праекты супрацоўніцтва ў сферы грамадзянскай супольнасці могуць атрымаць падтрымку, калі яны ажыццяўляюцца ў **Германіі, Арменіі, Азербайджане, Беларусі, Грузіі, Рэспубліцы Малдова і Украіне ці ў Расіі** і аб'ядноўваюць не менш за дзве праектныя арганізацыі (адна з іх у Германіі і не менш за адну ў адной з краін праграмы). Магчымы і вітаецца дадатковы ўдзел партнёрскіх арганізацый з **Францыі** і / або **Польшчы**. Падтрымка таксама можа быць аказана праектам з партнёрскімі арганізацыямі, якія знаходзяцца ў часовай эміграцыі.

Падтрымліваюцца **выключна <u>праекты ў сферы грамадзянскай супольнасці</u>**, гэта значыць – з суб’ектамі, якія не маюць дачынення да дзяржаўнай улады ці бізнесу.

Сродкі, якія выдзяляюцца, з’яўляюцца сродкамі праектнага фінансавання. Гэта значыць, што яны падпарадкоўваюцца прынцыпу гадавога бюджэтавання. Такім чы-нам, праекты павінны быць **завершаны** на працягу 2025 года, г. зн. **не пазней за 31.12.2025**. Выдзяленне Федэральным міністэрствам замежных спраў сродкаў на пра-екты, тэрмін выканання якіх выходзіць за рамкі года, магчыма толькі пры наяўнасці адпаведнага абгрунтавання.

Мінімальная сума падтрымкі складае 50.000 €; максімальная сума падтрымкі не вызна-чана. Кароткія апісанні праектаў (на нямецкай або англійскай мове) прымаюцца з <u>14 кастрычніка да 08 лістапада 2024 года</u> **ўключна** на сайце:

**<u>http://oepr.diplo.de</u>**

На гэтым сайце размешчана дадатковая інфармацыя і інструкцыі па падачы апісанняў праектаў. Унясенне змен у апісанні праектаў, якія ўжо былі пададзены, або падача апісанняў пазней вызначанага тэрміну немагчыма.

Атрымальнікі падтрымкі абавязаны прадаставіць дакументы для пацвярджэння мэтазгоднага выкарыстання атрыманых срокаў і справаздачы па праектах у адпаведнай форме. На аснове гэтых дакументаў Федэральнае ведамства па замежных справах і Федэральнае міністэрства замежных спраў праводзяць праверку мэтазгоднасці выкарыстання атрыманых сродкаў і паспяховасці рэалізацыі праектаў, а таксама праверку праграмы аказання падтрымкі ў цэлым. Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці ў Агульных і асаблівых дадатковых умовах, даступных для загрузкі, ці ў рамках паведамлення аб рашэнні, прынятым па заяўцы.

**Пры ўзнікненні пытанняў просім Вас спачатку азнаёміцца з раздзелам FAQ (папулярныя пытанні).** Калі на Ваша пытанне не знайшлося адказу, Вы можаце звярнуцца да адказнага аддзела Федэральнага ведамства па замежных справах. Калі ласка, дасылайце пытанні па электроннай пошце oepr@bfaa.bund.de ці адказным супрацоўнікам Федэральнага міністэрства замежных спраў:

Спадар Фабьен Нэс: 030 1817 1376 / 601-1@diplo.de (Беларусь, Расія)

Спадарыня Юлія Лютэр: 030 1817 4272 / 601-5@diplo.de (Рэспубліка Малдова, Украіна)

Спадарыня Марыетэ Пфістэр: 030 1817 7975 / 601-6@diplo.de (Арменія, Азербайджан, Грузія)

Спадар Даніэль Дэмеле: 030 18 4730 14 101/ daniel.demele@diplo.de

У выпадку ўзнікнення **тэхнічных праблем** пры карыстанні сайтам http://oepr.diplo.de просім звяртацца да спадарыні Юліі Мельтке (тэлефон: 030 18 4730 14125, E-Mail: bf-f-pf-1-17@auswaertiges-amt.de).